Цана асобнага нумару 15 гр. Przesyłka opłacona ryczałtem.

№ 33 (84). Вільня, Субота 9 Красавіка 1927 г. Год III

СЯЛЯНСКАЯ НІВА

Няхай жыве Беларускі Народ!

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, ЗАВАЛЬНАЯ 6. (Wilno, Zawalna 6.).
Рэдакцыя адчынена штодня ад 9 да 3 гадзіны апрача сьвята.
Рэдактар прыймае ад 12 да 2 гадз.

Зямля Сялянству бяз выкупу!

Падпіска:
на адзін месяц — 1 зал., на 3 месяцы — 2 зал., на 6 месяцаў 4 зал., на год — 8 зал.
Для заграніцы удвая даражэй.
Аплата надрукаванага залежыць ад рэдакцыі
ВЫХОДЗЕ Ў СЕРАДУ І СУБОТУ.

ОРГАН БЕЛАРУСКАГА СЯЛЯНСКАГА САЮЗУ.

Да працы!

Прэзыдэнт чэхаславацкай рэспублікі вялікі грамадзянін і дэмакрат Масарык у адной з сваіх пісьменьніцкіх прапаў адзначыў, што чэскі народ на шляху свайго адраджэньня і поўнага вызваленьня прайшоў у сваім разьвіцьці тры этапы: філялёгічны, эканамічны і палітычны. З пачатку тварылася і апрацоўвалася мова, пасьля пачаўся рух і барацьба за ахапленьне жыцьця гаспадарчага, у мэтах вырваць з чужацкіх рук промысел і гандаль і палепшыць палажэньне земляроба. Калі дасяганьні на гэтым другім этапе дапялі мэты, стала на парадку дня пытаньне аб сваей уласнай дзяржаве.

Гэтакі падзел чэскага адраджэнска-вызвольнага нацыянальнага руху для нас у некаторых выпадках можа быць прыкладам.

Гэты рух зьдзейсьніўшы нацыянальныя чэскія ідэалы, выразна сьведчыць, якое значэньне мае для кожнага паняволенага народу—здабыць эканамічную незалежнасьць і стаць на свае ўласныя ногі ў гаспадарчым жыцьці. Да таго часу пакуль народ не палепшыць сваей земляробскай гаспадаркі, пакуль ня культывіруе яе, пакуль ня збудуе ўласны промысел і гандаль — цяжка здабыці і ўтрымаці палітычныя правы.

Мы, Беларусы, асабіста, толькі што пачынаемо будаваць сваё нацыянальнае жыцьцё. Але калі прагледзім кароткі прапяг адраджэнскай гісторыі, дык перадусім угледзім, што і мы таксама як Чэхі, пачалі адраджэнскі рух ад мовы і што гэты першы этап нашага адраджэньня філялёгічны, амаль што дапяў сваей мэты. Цяпер мы пераходзім на новы эканамічны этап да культуральна-гаспадарчага будаўніцтва, да ахапленьня намі культурна-гаспадарчага жыцьця нашага краю і народу.

Якім шляхам, парадкам ці спосабам мы можам зьдзейсьніць гэта? — Арганізацыяй,—вось мой пэўны і станоўчы адказ!

Разумеючы гэта, лепшыя дзеячы Беларускага Народу год таму назад залажылі Інстытут Гаспадаркі і Культуры.

Як ужо відаць з вышэй пададзенага, галоўнаю мэтаю Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ёсьць—пашырэньне культуры як духовай, гэтак і матэр'яльнай цераз асьвету і палепшаньне гаспадарчага палажэньня цераз культурную працу і ахапленьне эканамічнага жыцьця ў свае рукі цераз коопэрацыю ўва ўсіх галінах прамысловасьці і мены. З мэтаю зьдзейсьненьня гэтых заданьняў Інстытут Гаспадаркі і Культуры закладае гурткі, якія арганізуюць бібліятэкі, чытальні, дамагаюцца роднае школы і наагул вядуць сваімі ўласнымі сіламі культурна-асьветную працу.

Інстытут арганізаваў і наладзіў коопэратыўна-гандлёвыя курсы, якія адбываюцца цяпер і якія маюць даць некалькі дзесяткаў падгатоўленых людзей да працы па коопэрацыі. Праўда, усё гэта даецца вельмі пяжка: тут стаяць на перашкодзе і матэр'яльныя варункі і варожыя адносіны да ўсяго гэтага польскага ўраду і нашая неасьведамленнасьць. Але ўсё-ж-такі капля па каплі ўліваецца жыватворчага бальзаму ў наш падупалы, кволы народны арганізм і шораз, дык становіцца прыкмятнейшым нашае нацыянальнае жыцьцё, шораз, дык рухлівей і жвавей зарысоўваецца поступ у арганізованнасьці, шораз, дык яскравей і ясьней выяўляецца жаданьне і імкненьне шырокіх масаў да творчае працы над будаваньнем гаспадарчай самабытнасьці.

Усяму гэтаму ідзе на спатканьне і з дапамогаю малады Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры, але-ж на вялікі жаль ён сам як грамадзкая арганізацыя без падтрыманьня з боку народу ня можа выпаўніць сваіх мэтаў, а дзеля гэтага жадае каб усё тое, што мысьліць разумна і здарова ўлілося ў яго рады, каб разам вялікаю грамадой ісьці да веды і культуры. Праз веду і культуру мы будзем вызваляцца з гаспадарчае галіты. Праца культурна-гаспадарчая ня толькі не павінна адрываць нас ад палітычнае працы, а наадварот павінна яшчэ ўзмацоўваць яе. Ёсьць ведама, палітычныя варункі зьяўляюцца асновай, якая спрыяе або мяшае гаспадарча-культурнаму разьвіцьцю народу, аднак гэтае апошняе робіць свой націск на палітычнае жыцьцё. Меж ім існуе выразная залежнасьць. Дык, маючы на мэце ўсе Ідэалы Беларускага Народу прыступайма да арганізаванай працы, абымаючы паступова паасобныя галіны грамадзкага жыцьця.

Група слухачоў Беларускіх Коопэратыўна-Гандлёвых Курсаў у Вільні і сяброў Інстытуту ў 9-ыя ўгодкі абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі. 25.III. 1927 г.

БЕЛАРУСКІЯ КООПЭРАТЫЎНЫЯ КУРСЫ.

Выконваючы свае мэты, Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры адразу пасьля зацьверджаньня статуту, прыступіў да арганізацыйнае працы. Гэтая праца хоць павольным, але пэўным крокам увесь час ідзе ўперад. Заснаваныя дагэтуль 52 Гурткі Інстытуту вядуць ужо культурна-асьветную і іншую працу самі на месцы, ладзячы беларускія спэктаклі, лекцыі, пашыраючы беларускае друкаванае слова і арганізуючы бібліятэчкі-чытальні, дамагаючыся беларускіх школ і інш.

Незалежна ад складаньня дэкляцыяў (на жаль, гэтая праца яшчэ не дала пажаданых рэзультатаў, бо ўлады ўсё-роўна не даюць урадавых школаў) Інстытут падаў некалькідзесят заяваў на прыватныя беларускія школы. Але і прыватных школаў улады не даюць, бо Інстытут атрымаў усяго толькі 7 канцэсіяў, а з іх толькі два вучыцялі зацьверджаны. Такім чынам, Інстытут утрымлівае толькі дзьве прыватныя школы: адну ў Слонімскім, другую ў Браслаўскім павеце.

Незалежна ад арганізацыйнай культурна-асьветнай працы Інстытут парупіўся і аб грамадзкай працы на гаспадарчым грунце. Ёсьць ведама, гэтую працу ня лёгка вясьці, бо яна вымагае вялікіх матэр'яльных сродкаў, якіх, якраз, Інстытут ня мае, бо яго сябры знаходзяцца ў цяжкіх матэр'яльных абставінах. Адзіная дарога, ідучы якой можна хоць крыху папраўляць нашу нацыянальную гаспадарку, ёсьць коопэрацыя. Толькі праз коопэрацыю, толькі праз супольную арганізаваную грамадзкую працу можна нам браць у свае рукі лей-

Да працы.

Наша шчасьце—ў працы, бра́цьця!
Годзі ждаці — годзі спаць!...
Сіратліваю бя́розкай
Годзі сумна выглядаць!
Ёсьць размах! — а сіл юнацкіх
Ці-ж ня хопіць ў бара́цьбе!?
Праз граніт, праз сталь да сонца
Мы праб'ем вакно сабе!
Хоць хвалюе мора злое...
Гэй, наперад з цемнаты,
Штырнік сьмелаю рукою
Пакіруй свой човен ты!
Брацьця! хто мы? ці-ж ня б'ецца
ў нас сьвятое пачуцьцё?
Ці-ж яно ўжо ня імкнецца
Стварыць лепшае жыцьцё?
Дайма-ж волю творчым сілам!
Кіньма спрэчкі, дык тагды
Лёс над краем нашым мілым
Запануе залаты!...

Міхась Васілёк.

Заграніца аб нас.

„Slovensky Prehled" čislo 3, ročnik XIX, дужа паважны месячнік, які выходзіць пад рэдакцыяю—знатака беларускае літэратуры і вялікага прыяцеля Беларусаў—Adolfa Černeho, прыносіць у №-ры за сакавік с. г. дужа вялікі (4 стар.) і цікавы артыкул: „Belorusove v Polsku", пяра самога паважанага Рэдактара. Аўтар характэрызуе сучасную эпоху жудаснага стану жыцьця нашага пад польскім панаваньнем і з болем адзначае: „... a tak i v teto važne chvili trva spor mezi obema beloruskymi tabory" (і ў гэтак важнай часіне Беларусы сварацца між сабою). Відаць, усе нашы прыяцелі добра зразумелі шкоду нашае сваркі і перасьцерагаюць нас, а мы ўвагі не зьвяртаем і пятушымся далей. Цікавы артыкул кончыцца думкаю: „Усё, аб чым сказалі, паказуе, што нялёгка будзе дайсьці да сапраўднага збліжэньня абодвых народаў" (беларускага і польскага — Ф. Г.).

У аддзеле—Jubilea—гэты самы месячнік прыносіць агляд літэратурнай творчасьці Якуба Коласа з прычыны 20-га ягонага літэрацкага юбілею.

„Narodopisny vestnik československy" č. 1, roč. XX, пад рэдакцыяй проф. д-ра Юрага Полівкі друкуе навуковую працу рэдактара часопісі (prof. d-r Jiri Polivka) пад загалоўкам: „Uvodni a zaverečne formule slovanskych pohadek" (Уступныя і канчатковыя формулы славянскіх прыказкаў). У гэтым артыкуле 5 старонак пасьвячана беларускім прыказкам.

цы, якімі кіруецца гаспадарчае жыцьцё. Маючы гэта на ўвазе Інстытут адразу выступіў перад уладамі аб дазволе на коопэратыўна-гандлёвыя курсы ў Вільні. Хоць даволі доўга прышлося чакаць на гэты дазвол, аднак нарэшце, у канцы лютага с. г. курсы пачалі функцыянаваць. Наагул было каля 60 заяваў ад кандыдатаў аб прыняцьці на курсы, але з прычыны недастачы памешканьня і срокаў прынята на курсы толькі 30 слухачоў, з якіх мужчын 28 і кабет 2. Паводле асьветы слухачы дзеляцца: з 8-мі клясавай гімназіяльнай асьветай—6 асоб; з 7-мі клясавай—3 асобы; з 6-ці кл.—1 ас.; з 5-ці кл.—3 ас.; з 4-х кл.—ас.; з 3-х кл.—6 ас. і б. вучыцялёў пачаткавых школаў—5 асоб. Большасьць слухачоў — 27 асоб прыехала з вёсак і 3 асобы мясцовыя з Вільні; усе замясцовыя жывуць у інтэрнаце пры курсах.

Навука на курсах стаіць на даволі высокім роўні, чытаюцца лекцыі па такім прадметам: Асновы эканомікі, Асновы і практыка коопэрацыі, Навука аб гандлі, Рахунковасьць коопэратываў, Гандлёвая арытмэтыка, Бугальтэрыя, Беларуская гандлёвая карэспандэнцыя, Польская гандлёвая карэспандэнцыя і Таваразнаўства. Усе лекцыі, апрача польскай гандлёвай карэспандэнцыі, вядуцца ў беларускай мове. Паводле агульнай адукацыі слухачоў і вынікаў дагэтуляшнай працы на курсах, можна сьмела сказаць, што навучаньне адбываецца з вялікай карысьцяй для слухачоў і, што пераважна ўсе будуць вельмі карыснымі працоўнікамі ў коопэрацыі. Праўда, не сярод усіх слухачоў ёсьць поўнае зразуменьне грамадзкай працы, аднак курсы таксама маюць на мэце паглыбляць гэтае зразуменьне і кіраваць слухачоў на выразныя шляхі грамадзкай працы ў гаспадарчай галіне жыцьця, бо толькі супольнай грамадзкай арганізаванай працай можам дайсьці да поўнага нашага вызваленьня.

Аб чэскай коопэрацыі.

(Па ўкраінскім даным).

У Чэхаў некалі таксама, як у нас цяпер, уся прамысловасьць, гандаль, ды наагул цалком усё эканамічнае жыцьцё было ў чужацкіх руках, толькі доўгаю, сыстэматычнаю і станоўчаю працаю і энэргіяй за некалькі дзесяткаў гадоў гэтакае палажэньне Чэхі зьмянілі зусім. Цяпер яны ў гаспадарчых адносінах зьяўляюцца панамі на сваей зямлі. Галаўнейшым спосабам, які памог Чэхам прысьці да эканамічнае сілы і значэньня, была коопэрацыя і то перадусім вясковая.

Разьвіцьцё коопэрацыі на чэскай вёсцы пачалося з 90 гадоў мінулага сталецьця арганізацыяй крэдытных коопэратываў па сыстэме Райфайзэна. У Чэхіі гэтыя таварыствы носяць назоў па імені іх першага арганізатараў Кампэліка—„Кампэлічка". У 1896 годзе быў заснаваны Цэнтральны Саюз вяскова-гаспадарчых коопэратываў, да якога ўвайшло 46 кампэлічак, у 1924 годзе гэты саюз меў 1667 таварыстваў, якія мелі 176.277 сяброў; у гэтых таварыствах было на 1 студзеня 1925 г. укладаў на 542.589.454 чэскія кароны, агульная сума гадовых зваротаў вынасіла ў саюзных таварыствах 1.323.212.297 чэс. кар. Ужо кожная чэская вёска мае свае крэдытнае таварыства. Чэхія ўжо мае гэтых таварыстваў столькі сколькі ей трэба. Чэскія крэдытныя таварыства зьяўляюцца цалком незалежнымі, якія ўтрымліваюцца толькі сваімі сродкамі. Яны ўзгадавалі новае пакаленьне сярод сялянства, прызвычаілі насяленьне ашчаджаць грошы, накіроўваючы на гэты шлях моладзь яшчэ са школьнае лавы. Дзякуючы таннаму крэдыту, які даюць таварыствы сваім сябром, чэскае сялянства вызвалена з ліхвярскіх рук, чэскае хлебаробства паднялося на высокую ступень разьвіцьця і стан яго перад вайною ўжо раўняўся высока-культурнаму нямецкаму хлебаробству.

Апрача „кампэлічак" чэская вёска знае яшчэ крэдытныя ўстановы другога тыпу—вясковыя пазычковыя касы. Гэтых касаў на 1 студзеня 1926 году было ў Чэхіі 939. Крэдытныя ўстановы гэтага тыпу, у сваей дзейнасьці зьбіралі капітал, які патрэбны для шырэйшае працы, пакіраванай да ўсебаковага задаваленьня вясковай гаспадаркі. Вельмі памыліўся-б той хто падумаў-бы, што чэская коопэрацыя абмяжоўваецца звычайнымі крэдытнымі апэрацыямі г. з. прыманьнем укладаў і выдаваньнем пазык. Яна ахапляе ўсю сялянскую эканоміку. Немагчыма нават усяго адзначыць і падлічыць, што творыць чэская вяскова-гаспадарчая коопэрацыя. Крэдытныя таварыствы даволі даўно, акрамя крэдытных апэрацыяў, сталі займацца закупкаю неабходных для сваіх сябраў прадуктаў — штучных гнаёў, машынаў, насеньня, спажывецкіх прадуктаў і вугальля. Пасьля былі створаны для гэтых апэрацыяў спэцыяльныя таварыствы. Поруч з апэрацыямі па закупцы прадуктаў, коопэрацыя пачала займацца збытам вяскова-гаспадарчых прадуктаў — збожжа усякага роду, сена, яек, жывёлы і г. д.

Пашырылася малачарская коопэрацыя. Паўсталі таварыствы супольнага выкарыстаньня вяскова-гаспадарчых машынаў. Паўсталі таварыствы па ўтрыманьню электрычных станцыяў, дзякуючы якім электрычнае сьвятло пашырылася па вёсках. Паўсталі поруч з гэтым і іншыя формы коопэрацыі. Цэнтральным Саюзам вяскова-гаспадарскіх коопэратываў у Празе ў 1925 годзе, было закупляна для коопэратываў 53.024 вагоны рожных гаспадарскіх матэрыялаў і прыладаў на агульную суму 167.417.140 чэскіх каронаў, прадана вяскова-гаспадарчых прадуктаў 8.277 вагонаў на 196.085.537 чэскіх каронаў, дастаўлена для войска гаспадарскіх прадуктаў 1.912 вагонаў на 26.673.171 ч. к.

Чэхія мае 81 коопэратыўных вялікіх фабрык, 8 коопэратыўных крахмальняў, 34 сушыльні цыкоры. Чэская коопэрацыя мае ўласныя млыны, пякарні, элеватары, малачарні, заводы для вырабаткі соладу, абработкі лёну, пераробкі фруктаў і г. д.

Вяскова-гаспадарская коопэрацыя памагла Чэхам нацыяналізаваць гандаль і прамысловасьць, палажыла цьвёрды фундамант для чэскай самабытнасьці.

У гэтым гаспадарчым і культурным падняцьці чэскага селяніна вялікую ролю адыграла і многа заслугаў палажыла чэская коопэрацыя.

Ці знайдзем мы, Беларусы, у сабе сілу і энэргію, ці загартуем у сабе цьвёрдую волю для таго, каб дайсьці да тае ступені разьвіцьця, на якой стаіць чэскі селянін?

Ніколі не зьнішчай газэты, прачытаўшы дай яе суседу.

З жыцьця пад Польшчай.

Самарэкляма.

Сэнсацыю польскага палітычнага дня становіць прыезд з Бэрліна амэрыканскага пасла Шурмана ў Варшаву. Газэты з трыумфам адзначаюць, што гэтая візыта сьведчыць аб вялікім факце—прызнаньня, што Польшча вялікая рэч, хоць аб гэтым ані пасол Шурман, ані хто з іншых амэрыканскіх палітыкаў не гаварыў.

Згода нашым коштам.

Усе галоўныя польскія партыі на нарадзе ў п. маршаляа Сойму згадзіліся прыняць самаўрадавы праект у тэй рэдакцыі, проці якое гэтак горача пратэставалі нац. меншасьці. У гэтай суполцы, якая імкнецца выкасаваць з жыцьця нацыянальныя меншасьці, мы бачым і радыкальнае „Вызваленьне" і сацыялістычную ППС і шавіністычную эндэцыю і хадэцыю. Нечага казаці, кампанія добрая! Як толькі адкрыецца соймавая сэсія, дык зразу праект аб валасных самаўрадах будзе разглядацца на пленуме.

Растрэлы.

У Торуню растраляна двох паручнікаў польскае арміі: Урбаняка і Пёнтка, якія вінаваціліся ў выдачы вайсковых сэкрэтаў на карысьць суседняе дзяржавы. Гэты прысуд зацьвярдзіў ген. Бэрбэцкі, а Прэзыдэнт памілаваць гэтых афіцэраў адказаўся.

Асуджаных растралялі на адным з фортаў у ваколіцы Торуня.

Лагер вялікае Польшчы.

Пад гэтакім назовам эндэк Р. Дмоўскі арганізуе партыю, якая ў імя дабра Польшчы адносіцца воража да сучаснага санацыйнага ўраду і яго верхавода марш. Пілсудскага.

Адбыліся зьезды гэтае „вялікае Польшчы" ў Львове і Быдгошчы—на якіх і прадэманстравалі свае намеры, настроі і няпрыхільныя адносіны да сучаснага ўраду.

Алярм хадэкаў.

Польскія хадэкі паднялі вялікую трывогу на шпальтах сваіх газэтаў аб сваей балячцы. Справа гэтага ў тым, што ў Катавіцах у часе, калі адбываўся хадэцкі зьезд напала банда (па словах „Rzeczpospolita"-й) умундараваных паўстанцаў В. Сілезіі і перашкодзіла адбыцца гэтаму зьезду.

Хадэцкая прэса за гэта абураецца на в.-сілезійскіх „санатараў" і востра крытыкуе адміністрацыю, якая дапушчае да гэтакіх гвалтаў над праявамі вольнай палітычнай думкі. Але хадэкі загаварылі гэтак тагды, калі адчулі салодкасьць на сабе, а тагды, калі сталася тое самае ў Бельшчыне над беларускімі пасламі і зьездам, дык хадэкі і самы выпадак гвалту і яго выканаўцаў хвалілі, прыдаючы ім геройства, якое цяпер называюць бандыцтвам і інш. падобнымі да гэтага словамі.

НАВІНЫ.

— **Лекцыя ў Бел. Інст. Гасп. і Культуры.** У нядзелю 10.IV с. г. у салі Інстытуту а гадз. 6 вечарам гр. Ал. Стэповіч прачытае лекцыю на тэму: „Галоўныя дзейнікі грамадзкіх зьявішчаў". Уваход бясплатны.

— **Беларуская вечарына.** У суботу 9 ч. красавіка аб 7 гадзіне ўвечары адбудзецца вечарына ў Беларускай гімназіі. Пастаўлена будзе п'еска „Паўлінка". Пасьля прадстаўленьня—канцэрт. Выручка пайдзе на карысьць незаможных вучняў гімназіі.

— **Сцэнічныя творы ў друку.** Хутка мае выйсьці з друку зборнік сцэнічных твораў, у якім будуць зьмешчаны наступныя творы для Беларускага Народнага тэатру: „Боты", „Мікітаў Лапаць", „Пакой у наймы", „Чорт і Баба".

— **Касаваньне сэрвітутаў.** Ужо арганізавана камісія па касаваньню сэрвітутаў, якая прыступіць прадусім да працы па касаваньню сэрвітутаў у дзяржаўных лясох на тэрыторыі: Віленскага, Навагрудзкага і усходняй часткі Беластоцкага ваяводства.

— **Цукер падаражэў.** Замест таго, каб патанець, як гэта было рэклямавана ўрадавай пастановай, цукер падаражэў на 10 процантаў.

— **Рэкорд.** За месяц сакавік праступнасьць жыхароў места Вільні гэтак пашырылася, што паліцыя за недатрыманьне правілаў публічнага парадку напісана аж 105 пратаколаў. Як відаць, дык паліцыя многа мае працы!

— **Работніцкая дэлегацыя.** У аўторак 5 г. красавіка п. Ваявода прыняў дэлегацыю работнікаў, якія будавалі, яшчэ аж у 1924 го-

дзе стражніцы на паграніччы і якім да гэтага часу ня выплачана. Работнікі прасілі п. Ваяводу аб дапамозе ім у атрыманьні ад працадаўцаў запрацаваных грошай.

— **Спрэчка.** На фабрыцы „Зэмша“ у Новай-Вялейцы паміж работнікамі і фабрыкантамі паўстала спрэчка, дзеля таго, што ня выплачана работнікам належная заработная плата.

— **Канфіската.** № 3, беларускай газэты „Наша Праўда“ па загаду Камісара Ўраду на м. Вільню канфіскаваны за перадавіцу „Праз акіян“.

Што дзеецца ў сьвеце?

Сытуацыя ў Кітаі.

Паміж Кантонцамі і паўночнымі буржуазнымі вайскамі Кітаю ідзе бойка, перавага ў якой астаецца за Кантонцамі.

У наступленьні на Пэкін, Кантонцы перашлі рэчку Жоўтую, недалёка Нанкіна; армія шакмунскага губэрнатара адступіла.

Чанг-Тсо-Лін мае намер распачаць контрнаступленьне проці Кантонцаў. Як удасца выканаць гэты плян, ня ведама; ёсьць чуткі быццам частка войск Чанг-Тсо-Ліна патаемна дагаварылася з Кантонцамі аб супольнай акцыі.

Міністар Кантонскага ўраду Чэн у прамове да карэспандэнтаў адзначыў, што рэвалюцыя ў Кітаі мае нацыянальны характар, але не камуністычны, хоць палітычная праграма Кантонцаў мае многа супольнага з камуністычнаю праграмаю. А дзеля гэтага самага Кантонцам карысна падтрымліваць добрыя адносіны з Масквою.

У будучыне магчымы ўдзел загранічнага капіталу ў гаспадарчым жыцьці Кітаю, але-ж пад апекаю ці пад наглядам кітайскага ўраду.

Нямецкія калёністыя не пагадзіліся з ўладамі Чанг-Тсо-Ліна і дзеля гэтага пакідаюць правінцыі занятыя гэтаю ўладаю.

Здарыўся напад на Японскі кансулят у Ханькоў, дзеля гэтых прычынаў японцы высадзілі ў Ханькоў сваё войска.

Бэтлен у Рыме.

Урадовая партыя Вэнгрыі начале з прэм'ерам Бэтленам—жыве лятуценьнямі на адбудову манархіі і пашырэньня Вэнгрыі аж да мора. Зьдзейсьненьне сваіх намераў Вэнгерцы бачаць у Саюзе з Італіяй, для закапаньня якога, прэм'ер Бэтлен паехаў у Рым і гэтак угадзіў Італіі ў яе агрэсыўнай палітыцы на Балканах, што асабіста ад Мусаліняга атрымаў вялікую істужку ордэну Сьвятых Маўрыцыя і Лазара.

У Літве.

Паводле польскіх газэт на чугунучнай станцыі ў Коўне палітычная паліцыя арыштавала пасла Сойму Паюса, які належыць да літоўскай народнай партыі. На знак пратэсту проці пагвалчэньня Канстытуцыі, сябры народнай партыі пакінулі паседжаньне камісіі замежных спраў.

Маніфэстацыя ў Данцыгу.

У вольным Данцыгу адбылася маніфэстацыя Немцаў. Гэтая маніфэстацыя выказала зусім натуральнае ймкненьне данцыгскіх Немцаў да дзяржаўнага аб'яднаньня з Нямецкай Рэспублікаю.

Данцыгскія газэты між іншым пішуць: „Ня можам ніколі дапусьціць да таго, каб маладое Нямецкае пакаленьне забылася аб вайне. Супольнаю мэтаю ўсіх Немцаў ёсьць сёньня дайсьці да таго, каб новая вялікая Нямеччына аб'яднала ўсіх Немцаў гэтак, каб ніякі Немец ня жыў за граніцамі нямецкае дзяржавы“.

Перад разаруженьнем.

У Жэнэве радзіць камісія аб падгатоўцы канфэрэнцыі аб разаружэньні, а над гэты „шумок“ — Францыя павялічвае ваенны флот на моры, а Гішпанія і Італія паветранны. Дый наагул усе дзяржавы спадзяюцца вайны, бо ўваружаюцца з мэтай захвату чужых тэрыторыяў.

Францыя і Нямеччына.

Паміж Францыяй і Нямеччынай падпісаны правізарычны (часовы) гандарчы дагавор, які будзе надставаю для запраўднага гаспадарчага дагавору.

Прысылайце грошы на падпіску.

* * *

Падпісалася ты на бачыні
Проціў даты ў бягучым тым дню:
Я заўважыў і ў той-жа хвіліні
Запаліўся ў пламеньнях вагню,
Мне хацелася ўбачыці рыскі
Тваей, люба, ў сшыточку падпіскі.

Ты пазнала ўсё гэта адразу
І нявольны усьмешак усплыў
На рубочкі між вуснаў для сказу,
Пазваленьня ён знакам мне быў,
А таёмныя вочы з забавы
Гаварылі «які ты цікавы!»

* * *

Ты глянула, помню, навокал
І раптам зьбялела, як сьнег,
Што сталася? Нехта з далёка
Так уразіў тваё вока
І бледам зьмяніў любы сьмех.

Што гэта? Ці можа птушына
Прад вочмі тваймі ў перабег
Асьнежыла твар твой, дзяўчына,
Мо' гэтая чорна птушына
Прагнала із вусначкаў сьмех?...

Фр. Грышкевіч.

З жыцьця студэнтаў.

(З дакладу Прэзыдыуму АБСА).

Аддзел міжнародных зносін АБСА.

Пачынаючы ад уступу АБСА ў CIE (Міжнародную Студэнскую Канфэдэрацыю) Аддзел Міжнародных Зносін вядзе чулае супрацоўніцтва з чужаземным студэнствам, а галоўным парадкам з Цэнтраляю CIE. Аддзелам у свой час паданы патрэбныя інфармацыі ў часопісі Цэнтралі CIE аб Беларусах і беларускім студэнстве.

У канцы 1926 г. і на пачатку 1927-га вялася чулая перапіска з III-й камісіяй CIE ў справе абмену студэнтамі паасобных народнасьцяў на час фэрыяў. У гэтай-жа справе ў днёх 12 і 13 студзеня 1927 году адбылася нарада ў Бруксэлі (Бэльгія).

Ня гледзячы на тое, што справа абмену для Беларусаў дзякуючы адсутнасьці сваей дзяржавы і сродкаў, актуальнай быць ня можа, на азначанай нарадзе Беларусы (АБСА) былі заступлены іншымі.

У сучасны момант аддзел вядзе перапіску з III камісіяй CIE аб студэнскіх экскурсіях, якія ладзіць вышэйпамянутая камісія. Экскурсіі маюць адбыцца ў Атэны (Грэцыя), да Паўночнае і Паўднёвае Афрыкі (паасобна), Паўночнае Амэрыкі, Жэнэвы (Швайцарыя) і нарэшце IX канфэрэнцыя CIE ў Рыме.

Экскурсіі платныя. Жадаючыя прыймаць удзел маюць зьвяртацца да Аддзелу Міжнародных Зносін АБСА.

З Цэнтралі CIE (Бруксэль) Аддзел атрымаў копіі просьбаў (са ўсімі дакладамі) аб прыняцьці ў сябры CIE ад студэнства Злучаных Штатаў Паўночнае Амэрыкі і студэнтсва Урагвая, па якім на прапазыцыю кіраўніка Аддзелу прэзыдыум АБСА 12.III. 1927 г. выняс пастанову: „Вітаць пашырэньне ў сусьветным маштабе студэнскага супрацаўніцтва і выходзячы з гэтага высказацца за прыняцьце вышэйазначаных студэнтскіх Цэнтральных Саюзаў сябрамі CIE.

Першы віцэ-прэзыдэнт CIE п. Макадам (Англія) паведамляе Аддзел аб паразуменьні між CIE і Цэнтраляю нямецкага студэнства, якая да гэтага часу сябрам CIE не была, дзякуючы таму, што арганізавана на прынцыпе нацыянальным, а не тэрыторыяльным і што дамагалася ўраўнаньня нямецкае мовы з французскаю і ангельскаю ў дзелаводстве CIE. Гэтае пытаньне, як вядома, позытыўна разьвязана VIII канфэрэнцыяй CIE ў Празе Чэскаў (18—28.VIII 1926 г.).

На IX канфэрэнцыі CIE ў Рыме мае быць дэфінітыўна разьвязана пытаньне ўступу (як сябры) „Deutschen Studentenschaft“ у CIE.

Аддзелу надыйшлі просьбы ад паасобных студэнтскіх Нац. Саюзаў Эўропы аб высылцы ім арыгінальных народных твораў як: сказак, лягенд, старынных жартаў або забаўных апавяданьняў, слоў і нот арыгінальных, народных песень, дзеля надрукаваньня іх у органах паасобных Нацыянальных Студэнтскіх Саюзаў пасярэдніцтвам прэзыдыуму АБСА. Кіраўнік Аддзелу зьвяртаецца да беларускіх культурнікаў з просьбаю аб помачы яму ў гэтай справе.

Прэзыдыум АБСА.

Да нас пішуць.

Вось дык заробкі!

(З Войстамшчыны, Вялейскага пав.).

Трудныя жыцьцёвыя ўмовы вясковага жыхара, кожнаму з нас вядомыя. Селянін нідзе ня мае заработку нат' аднаго гроша, а калі часамі і здарыцца зарабіць дзе-колечы, дык трэба цяжка, цяжка папрацаваць праз цэлы дзень, каб атрымаць хаця 1 зал.

Зусім інакшыя заробкі маюць паны войты, пісары, вучыцелі, паліцэйскія, духоўнікі і іншыя ўраднікі бо яны атрымоўваюць вялізарную пэнсыю, каторая дасягае да 250 зл. ў месяц (болей як 8 зл. у дзень).

А найлепей маецца ў нас ксёндз Войстамскай парахвіі пр. Мочульскі; ён дык за 1-ну гадзіну працы, што пасьвянціў гміннае памешканьне—атрымаў аж 100 зл., з нашых, сьлязьмі абмочаных падаткаў.

Дзесяты.

Цёмная справа.

(Асада Самкі, Маўчадзкае гм., Баранавіцкага п.)

Пры шашэйнай дарозе (м-ка Моўчадзь — станцыя Моўчадзь) маляўніча раскінулася ў падножжа нявысокай гары, маленькая вёсачка — асада Самкі. З аднаго боку асады праходзіць чугунка (Вільня—Баранавічы), а з другога — цягнецца ланцуг узгоркаў, пакрытых хвойнымі дрэвамі. У канцы асады, у некаторым аддаленьні ад рэшты дамоў, стаіць пры самым лесе маленькая сялянская хатка, у якой жыве бедная сям'я: Марфа Хаванская, маладая, хворая на сухоты, дзяўчына 23 гадоў, старыя, таксама хворыя бацькі, што знаходзяцца на ўтрыманьні сваей дачкі. 13.-III г. г. разыгралася тут, нябывалая дагэтуль, драма, маючая палітычную падкладку і, дзеля гэтага ўсхваляваўшая ўсё грамадзянства гміны.

Для яснасьці вярнёмся крыху назад і пачнём сваё сумнае апавяданьне ад кастрычніка 1925 г. У гэтым часе М. Х. была арыштавана разам з многімі другімі сялянамі (каля 100 асоб з розных вёсак) за прыналежнасьць быццам да КПЗБ. Усе арыштаваныя былі зразумела, пасаджаны ў вастрог. М. Х.—дзяўчына дужа слабая фізычна—пасьля 6-месячнага прабываньня ў Гарадзенскім вастрозе захварэла на сухоты, у выніку чаго на прапазыцыю доктарскай камісіі была звольнена з вастрогу і ўзята пад нагляд паліцыі. Але здароўе яе не палепшала на свабодзе, бо трэ' было працаваць, каб пракарміць сябе і старых хворых бацькоў. Ад рана да вечара працавала яна ў розных мястачковых жыдоў, выпаўняючы часта непасільную работу за мізэрную плату. З нязвычайнай цярплівасьцю пераносіла яна паніжэньні, зьдзекі і паняверкі. Не зважачваючы ўвагі на хваробу, упарта вяла барацьбу з няўдзячным лёсам за свае істнаваньне...

У студзені 1927 г. М. Х. даведалася, што жыхар асады Самкі, І. П. атрымаў ад агента палітычнай паліцыі з Барановіч ліст, у каторым гэты апошні прасіў І. П. забіць Х. За гэта агент абяцаў даць яму 500 зл. На запытаньне Х. ці гэта праўда, І. П. адказаў: „праўда“. Аднак падрабязна гэтае справы высьвятліць не хацеў і ліста нікаму не паказаў. Кожны тутэйшы грам-н добра ведае, што І. П. таксама служыць у дэфэнзыве, як канфідэнт, дык і ня мог ніхто зразумець, чаму ён сам распаўсюджвае гэтую вестку. А дзеля таго, што ўсе лічаць яго дурнем, якім ён ёсьць у запраўднасьці, то ніхто гэтай вестцы ня прыдаў вялікага значэньня.

Праз два тыдні пасьля атрыманьня актаў абвінавачаньня М. Х. ў 7 гадз. вечара 13.-III г. г. зайшла да свайго суседа В. пагутарыць аб сваей справе. Усьлед за ёю туды-ж прыйшоў І. П. Бачучы, што Х. зьбіраецца ісьці да дому, ён пасьпяшыў выйсьці з дому першым. Хутка за ім выйшла на двор Х. і, нічога не падазраваючы, накіравілася да свайго дому. Раптам пачула яна, што сільныя рукі схапілі яе з-заду і моцна сьціснулі за горла, а пасьля накінулі мяшок на галаву і павалаклі па дарозе ў хвойнік. Х. з усіх сіл пачала вырывацца з рук цягнуўшых яе трох бандытаў, якія ціха гаварылі між сабой папольску і панямецку. Адзін з іх сказаў: „Трэба тут-жа яе забіць!“ Другі адказаў: „Не, мы павінны зрабіць так, як умовіліся“ і пацягнулі далей. Тым часам у няроўнай барацьбе, беднай дзяўчыне ўдалося нейкім цудам сарваць з галавы мяшок і ўступіць ў барацьбу яшчэ больш заядла. Аднаму з напаўшых яна адкусіла палец, другому падрапала да крыві твар. Тады адзін з бандытаў паваліў яе на зямлю, заткнуў рот і моцна зьвязаў. Пры гэтым удары Х. па галаве так моцна, што страціла яна прытомнасьць. Што было далей—дзяўчына ня памятае...

Праз паўгадзіны пасьля апісанага здарэньня вяртаўся са станцыі Моўчадзь камандант пастарунку ў м-ку Моўчадзі і заўважыў у ста-

ране ад дарогі нейкі цёмны прадмет, які вісеў на хвойцы. Затрымаўшы фурманку камандант шыбка пайшоў да хвойкі. Тое, што ён убачыў, выклікала-б дрыгату ў самага сьмелага чалавека. На хвойцы вісела М. Х. Ногі яе былі прывязаны да аднае галіны, а рукі — да другое. Шыя была цесна абкручана шалем, а сагнутае цела — вяроўкай. Камандант перарэзаў шабляй вяроўкі, зьняў з шыі шаль і зараз-жа адвёз яе да бацькоў, пасылаючы адначасна па доктара. Пасьля доўгіх забегаў доктару ўдалося вярнуць ёй прытомнасьць, што дала магчымасьць паліцыі сьпісаць паказаньні. На аснове гэтых паказаньняў паліцыя арыштавала І. П., але, па незразумелым для нас прычынам, хутка выпусьціла яго па свабоду. М. Х. ужо 6 дзён, як сноп, ляжыць на парозе сьмерці. Гаварыць хворая ня можа і толькі ад часу да часу вырываюцца з грудзей яе аддзельныя словы—шаптаньне. Паварушыцца таксама ня можа, бо ногі і рукі яе перадушаны вяроўкамі, а сьпіна страшэнна надвярэджана.

Бедная ахвяра палітычных інтрыгаў!..

Ярашэвіч.

Беларуская вечарына.

(В. Люшнева, Баранавіцкага пав.)

Па ініцыятыве Перхавіцкага Гуртка Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры адбылася вечарына ў запустовую суботу 5 сакавіка г. г.

На пачатку вечарыны былі прачытаны наступныя лекцыі: „Беларуская літаратура", „Значэньне кооперацыі" і „Алькаголь і барацьба з ім".

Гэтыя лекцыі ў лучнасьці з заклікам ісьці да Сьвету Праўды, Дабра і Хараства цераз культурную працу, зрабілі на прысутных вялікае ўражаньне.

Пасьля лекцыяў адбыліся сьпевы і дэкляцыі.

Гр. Шаршанеўскі прадэклямаваў некалькі гумарыстычных куплетаў, гр. Я. Дэшкоўскі — верш Н. Арсеньневай „Шчасьце" і гр. Я. Кургальскі — верш Янкі Купалы „З прасоньня".

Вечарына прайшла без ніякіх інцыдэнтаў і закончылася а 3 гадзіне ў ночы.

У гэты вечар у сялянскай моладзі выяўлялася жаданьне шукаць новыя шляхі да сонечнай будучыны, да тварэньня гармоніі і праменных формаў жыцьця. Выяўляліся, у яе маладой прыродзе, аптымізм і пад'ём пачуцьцяў імкненьні да Сьвятла і Радасьці.

Сярод прысутных можна было адчуць крык набалеўшай душы і вызвольнае яе ўваскрашэньне. Вясковы культурнік.

З тутэйшага жыцьця.

(Бярэза-Картуская, Пружанскага павету).

Двох суседзяў у мястэчку Бярэза-Картуская Антон Белевіч і Цярэнці Міронаў судзіліся ў мясцовага судзьдзі за мяжу сваіх агародаў. У часе разгляду справы, на пытаньне судзьдзі п. Невядомскага, да „павода" — Антона Белевіча чаму ня добра напісаў заяву (другі раз аб той-жа справе) Белевіч адкрыта адказаў, што заяву гэтак сьпісаў як было напісана ў чарнавіку пана судзьдзі. Гэты адказ зрабіў вельмі нядобрае ўражаньне. Выходзіць, што судзьдзя і судзіць і займаецца адвакатурай. Але гэта была-б малая бяда, калі-б ён пісаў толькі заявы. Гора жыхароў у тым, што той, каму піша заяву ўжо напаўна і выграе такую справу, хаця-бы яна і была несправедліва. Так і тут: тойжа самы Белевіч выграў адразу пяць спраў проці свайго суседа Міронова, бо па ўсіх справах даваў парады і пісаў сам судзьдзя. Праўда, усе гэныя справы акружны суд пакіраваў на карысьць Міронова, але кожнаму вядома, якія вялікія страты панёс Міронаў на адвакатаў і апэляцыі, каб зьмяніць пастановы картускага судзьдзі і, няма дзіва, што Міронаў гэтак зьбяднеў, што застаўся нават без каровы.

Гарачка.

Пісьмо з Палесься.

У апошнія часы расейская рэакцыя на Палесьсі заварушылася.

Трэба адцеміць, што галоўная кватэра „коренных-русских людей" знаходзіцца ў Берасьці. У Берасьці яны ўтрымоўваюць гімназію, ў якой русыфікуюць беларускую і ўкраінскую моладзь.

У апошнія часы гэтыя расейцы берасьцянскага вырабу пачулі якісь грунт пад нагамі. 5 сакавіка ў памешканьні мясцовай расейскай гімназіі было наладжана сьвяткаваньне Гогалеўскіх угодкаў. Выступалі з прамовамі дырэктар гімназіі і шмат іншых.

Але вось самае цікаўнае — ў прамове дырэктара пачулася старая, даўно нячуваная мэлёдыя: „Осени себя крестнымъ знаменемъ православный русскій народъ—отъ финскихъ скалъ до пламенной Калхиды; люди русскіе, православные, о великій, могучій" і г. д.

Слоў ня памятаю і стэнографічнае справаздачы даць не магу. Схапіў я толькі мэлёдыю: сумную, г эткую ім прыемную... зусім як за нябошчыка Мікалая. Гаварылася аб трох „нарѣчіяхъ" адзінага і непадзельнага народу і іншых бздурствах.

Ідэі старарэжымных зброў разам з іх насіцелямі аджылі і ня варта аб іх пісаць і разьбіраць іх крытычна. Але шкада, што гэтыя міязмы атручваюць арганізмы моладзі, якая ў будучыне адпакутуе за чужыя грахі.

Obserwator.

Гаспадарскі аддзел.

Аб даглядзе фруктовых дрэваў.

У часткі беларускага сялянства ёсьць каля хаты калі не садочак, дык хоць некалькі фруктовых дрэваў, але самых фруктаў, дык рэдка калі можна відзець, бо найбольш здараецца на фрукты няўрод. А няўрод гэты здараецца часта якраз у той час, калі за паўвярсты ў абшарніцкім садзе ад фруктаў аж галіны гнуцца. Дык чаму-ж гэта так здараецца?—А таму што абшарнік мае дагляд за сваім садам, а селянін больш ужо яго не даглядае. Дык і ня дзіва пасьля гэтага, што заўсёды бывае няўроду сялянскім фруктовым садочку!

Усякая рэч, а ў тым ліку і фруктовае дрэва вымагае абслугі і то пільнай і ўмелай абслугі, а калі ня прыложаш рук да чаго, дык яно так і змарнуецца.

Фруктовае дрэва вымагае сталага дагляду і за карэньнямі і за галаменем і за гальлём (крона). Пра дагляд за карэньнямі мы напішым іншым разам, а цяпер раскажам пра дагляд за гальлём.

На старых фруктовых дрэвах растуць часта ўсторч тоненькія галінкі, дык іх трэба позна ў восень або перад вясною абрэзаць і наагул пашырацца гэтакім галінам не даваць. Трэба таксама абрэзаць усе тыя галінкі, якія растуць не на вонкі, а ў сярэдзіну. Трэба абрэзаць усе сухія галінкі ды гэтакія, якія адва аб другую труцца.

Пры кожнай абрэзцы ўсе раны дрэва трэба замазаць садовым клеем, дуплы замошчваць гіпсам, глінаю, або цэмэнтам. Мох які зьяўляецца на гальлі, або якія іншыя лішаі трэба старанна саскрабсьці. Гэта так сказаць толькі ўступ да працы над даглядам. Гэта бязумоўна дапаможа дрэву даць плод, але-ж галоўная праца, дык вось у чым:

Калі ўмела і старанна даглядаць дрэва, дык яно пачне штогод даваць фрукты.

Калі ідзе аб дагляд за гальлём фруктовага дрэва, дык гэта робіцца так: Трэба прыкмеціць якая галінка не дае фруктаў, або дае іх мала, а ўжо ўвосень, ці на прадвесьні гэтакую галінку трэба зрэзаць не зусім, а толькі, калі галінка вялікая, дык палавіну. Гэта робіцца дзеля таго, што ад гэтакае галінкі пайдуць пасынкі, якія за адзін год значна падрастуць, дык пасьля трэба ўжо ізноў усе гэтыя пасынкі разгледзяць і тыя, якія будуць прыдатнейшыя пакінуць, а горшыя абрэзаць на чыста. Апэрацыя гэтакая карысная тым, што маладыя галінкі будуць ужо пладнейшымі. Але-ж гэтакай апэрацыі ня трэба рабіць адразу над многімі галінкамі, а паступова і то толькі над тымі, якія вымагаюць гэтага.

Калі галінка мае даўжыні 3—4 вяршкі, дык абрэзку можна рабіць перад чацьвёртым лістком і то, толькі да палавіны красавіка, калі дрэва яшчэ не распусьцілася.

Уся гэтая праца бязумоўна вымагае старанья і любасьці да таго, над чым працуем. Таксама ўва ўсіх гэтых апэрацыях трэба быць уважлівым, каб часам посьпехам ці няўважлівасьцю не пашкодзіць дрэву.

НАШАЯ ПОШТА.

Я. Окушко: Праграму інструкцыі і заяву паслалі.

Л. Сьлёзка: Верш атрымалі, зьмесьцім крыху пазьней.

П. Шыбуту, Прахімовічу, А. Мытыльскаму, Сьлёзцы А., Гонаму, Чарнюкевічу: Карэспандэнцыі атрымалі, памагчымасьці зьмесьцім.

Пракопцу: Вашыя вершы і жарты заслабыя.

Ярашэвічу: „Не парцэляцыю а спэкуляцыю" дасталі, надрукуем.

Залану: „Беларус ад сну прабуджаецца" дасталі, памагчымасьці надрукуем.

Сонураку: Карэспандэнцыі атрымалі.

Рашэтніку А., Машчонскаму М., Марозу М., Бірану А., Ждану К., Бірану А., Ціхановічу Ул., Крупічу І., Шуманскаму Ю., Машчанскаму Я., Сенько М., Гарноўскаму Ул., Коту А., Шкулене П., Арлу Я., Шмыку І., Лейкевічу М., Каролку А., Ждану А., Анішчыку М., Раманоўскаму Я., Алесяву М. Ярошу Ф., Качорнаму П., Маркевічу М., Безусаму А., Чубрыку Ш., Лукшэвічу М., Саку К., Саку А., Менкоўскаму Я., Чырчыку У. — пробны нумар паслалі.

Данішэвічу Я., Окушцы Я., Бельскаму М., Садоўскаму В., Уласіку Ф., Баркоўскаму С., Марозу К., Раманчыку М., Матусэвічу Г., Мамончыку М., Куневічу М., Глыбокаму П., Трахімовічу А., Мікуце Ф., Галавачу Ц.—газэту пасылаем.

Дасталі ад:

Дубовіка Івана—3 зл.; Шлюхі Баляслава, Русіна Міхася, Скуліна Пётры, Гадузы Рафала Міхнюка Уладзіміра—па 2 зл.; Цішасловіча Пётры—1 зл.

Друкарская абмылка.

У № 31 „Сял. Нівы" абмылкова надрукавана ў артыкуле „Родныя Гоні" слова „Намаш", замест „Нямаш"; а таксама ў „павялічыць людзёў" замест „павялічыць лічбу людзёў".

Афяры на палітычных вязьняў.

Атрымана на палітычных вязьняў ад гр. Мурашкі Юстына 5 зл.

АБВЕСТКІ:

Дзяржаўная школа будаўляных рамёслаў у Вільні, Капаніца № 5.

Запісы не аддзелы: мулярскі і цэгельскі распачынаюцца ад сягоньня і прадоўжыцца да 1-га траўня.

Курс навукі правідлова трывае 2 гады і дзеліцца на 2 сэзоны: зімовы і летні. Зімовы тэорэтычны—зачынаецца ад 1 лістападу, а канчаецца ў сакавіку і ахапляе: рэлігію, палянісьтыку, арытмэтыку, геамэтрыю, фізыку, пачатковую веду з хіміі, будаўляныя матэрыялы, будаўніцтва, рысункі. Летні сэзон практычных заняткаў адбываецца на будове, пачынаючы ад Вялікадня аж да 15 кастрычніка.

Вакацыйны час—адпачынковы—трывае два тыдні вясною і ў восень.

Прыймо вучняў адбываецца 2 разы на год: у восень перад пачаткам тэорэтычнага курсу і вясною на практычны курс будовы.

Вучань па аканчаньні школы атрымае школьнае пасьведчаньне сталай, здольнай працы у выбранай спэцыяльнасьці.

Навука ў школе дармова.

Пры школе для бедых вучняў ёсьць бясплатная бурса (інтэрнат), дзе вучні атрымліваюць сталаваньне і супольнае памешканьне.

Варункі прыняцьця.

1. Аканчаньне 16 гадоў, а дзеля гэтага трэба мець мэтрыку нараджэньня.
2. Аканчаньне 3 аддзелаў пачаткавай школы, ці адпаведны экзамен.
3. Пасьведчаньне маральнасьці з парахвіі.
4. Пасьведчаньне аб прышчэпе воспы.
5. 2 фатаграфіі.

Заявы прыймае і інфармуе школьная канцэлярыя штодня ад гадзіны 7 раніцы да 12 паўдня ў Вільні, на вуліцы Капаніца № 5.

Вільня, 1927 г. **Дырэкцыя школы.**

Беларуская Кнігарня „Пагоня"

Вільня, Завальная 7.

Прадае на месцы і высылае на правінцыю беларускія кніжкі рожнага зьместу, сцэнічныя творы, школьныя падручнікі, пісьменныя прылады і інш.

На правінцыю Кнігарня пасылае кніжкі наложным плацяжом, лічачы найніжэйшыя цэны.

Хто хоча выпісаць кніг павінен прысласць адкрытку, падаючы толькі свой адрэс і назовы кніжак, якія патрабуе. Кнігарня адразу споўніць заказ, за які трэба заплаціць на пошце пры атрыманьні кніжак. З заказамі зварочвайцеся на адрэс: **Вільня, Завальная 7, кнігарня „Пагоня".**

Рэдактар і выдавец К. Мацкевіч. Беларуская Друкарня ім. Ф. Скарыны, Вільня—Людвісарская 1.